


**Убачылі сіваграка ў пойме р. Сож?**
**Тэлефануйце!**
**8 (029) 760-22-42, Максім Тарантовіч,**
**арнітолаг Нацыянальнай акадэміі**
**навук Беларусі**





**Дзейнічайце разам з намі для захавання прыроды Беларусі!**




## Мы – Захавальнікі ТВП “Гронава”!

Калі Вы жывяце каля поймы р. Сож у наваколлі г. Чэрыкаў ці маеце магчымасць тут бываць, Вы можаце стаць Захавальнікам ТВП “Гронава” і дапамагчы зберагчы яе для нашчадкаў.

Удзельнічайце ў захаванні ТВП “Гронава”, паведамляйце пра пагрозы і свае назіранні супрацоўнікам АПБ, прыродаахоўных інспекцый.

## Як далучыцца да нас?

**Заходзьце на старонку**
**www.iba.ptushki.org**
**або тэлефануйце:**
**8 (017) 263-06-13**

**ГА “Ахова птушак Бацькаўшчыны”**
8 (017) 263-06-13, www.ptushki.org
8 (029) 223-06-13, info@ptushki.org
8 (029) 101-68-87 www.vk.com.ptushki
www.fb.com/APB.BirdLife.Belarus

Здымкі: С. Левы, І. Рускіх, І. Самусенка, С. Сіроткін, М. Тарантовіч, Дз. Якубовіч, У. Янушэвіч, С. Спасаў, www.shutterstock.com

Праект DCI-NSAPVD/2012/292081 “Прырода важна для ўсіх. Умацаванне аховы прыроды праз развіццё лідэрства і ўдзел мясцовага насельніцтва ў працэсе прыняцця рашэнняў на мясцовым узроўні” рэалізуецца ГА “Ахова птушак Бацькаўшчыны” пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза. За змест выдання адказвае ГА “Ахова птушак Бацькаўшчыны”

ООО «РИФТУР ПРИНТ» Свидетельство о ГРИИРПИ № 1/284 от 09.04.2014 г. Типография УП «Джи энд Ди» Свидетельство о ГРИИРПИ № 2/36 от 13.01.2014 г. Тираж 2000 экз. Заказ 412

Грамадская арганізацыя
**“Ахова птушак Бацькаўшчыны”**
www.ptushki.org



Сівагракі

Тэрыторыя, важная для птушак

# ГРОНАВА

Праект фінансуецца ЕС

BirdLife IBA ТЭРЫТОРЫЯ ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК



## Што такое ТВП?

Эфектыўным метадам аховы многіх відаў жывёл і раслін з'яўляецца захаванне прыродных тэрыторый, неабходных для іх існавання. Адзін з падыходаў – гэта выдзяленне ў адпаведнасці з пэўнымі крытэрыямі Тэрыторый, важных для птушак (ТВП), якія забяспечваюць выжыванне папуляцый большасці відаў птушак. Гэта месцы гнездавання, зімоўкі ці міграцыйныя шляхі тых відаў птушак, якія маюць неспрыяльны ахоўны статус або знаходзяцца пад пагрозай знікнення.

Сусветная праграма ТВП ахоплівае 200 краін, больш за 12 000 тэрыторый, з якіх 51 знаходзіцца ў Беларусі.

**Карта Тэрыторый, важных для птушак Беларусі**




## Цікавыя факты пра ТВП "Гронава"

**1** Тут захавалася невялікая паселішча сівагракa – адной з самых прыгожых і рэдкіх птушак Беларусі. У сярэдзіне XX стагоддзя гэта быў звычайны від птушак, але сёння захаваліся толькі адзінкавыя пары сівагракаў!

**2** Тэрыторыя выкарыстоўваецца для выпасу кароў, лесагаспадарчай дзейнасці, рыбнай лоўлі і адпачынку.

**3** У пойме ракі Сож захаваліся адкрытыя поплаўныя лугі, дзе існуе ток дубальтаў, гняздуюцца вялікія грыцукі, а ў час міграцыі спыняюцца баталёны. Усе яны занесены ў Чырвоную кнігу.


Баталёны


Дубальт

**4** ТВП "Гронава" ўключае лугі і лясныя масівы ў пойме р. Сож у наваколлі г. Чэрыкаў. Тэрыторыя часткова ўваходзіць у мясцовы ландшафтны заказнік "Чэрыкаўскі".

**5** Паселішча сівагракаў размешчана ў стараўзроставым сасновым лесе з адкрытымі прагалінамі, дзе птушкі гняздуюцца ў старых дуплах чорнай жаўны і палююць пераважна на насякомых. Стары сасновы лес таксама аблюбавалі ляякі і клінтухі.


Ляляк


Сівагракі

## Што пагражае ТВП "Гронава"?

- Малая плошча і адсутнасць прыродаахоўнага статусу для ўсёй тэрыторыі робяць яе вельмі ўразлівай.
- Зарастанне прагалін і высечак прывядзе да страты маланасці тэрыторыі і прывабнасці яе для сівагракаў з-за знікнення кармавых угоддзяў.
- Высечка дрэў з дупламі прывядзе да памяншэння колькасці патэнцыйных "птушыных кватэр". Асабліва каштоўныя вялікія дуплы чорнай жаўны, у якіх гняздуюцца сівагракі.
- Зарастанне адкрытых лугоў хмызняком з-за змяншэння выпасу кароў робіць немагчымым гнездаванне кулікоў. Зараз хмызнякі ёсць на левабярэжным лузе, тады як на правабярэжжы яшчэ захаваўся выпас.

